Подписка на газету "Народная воля" продлена до 10 сентября. Мы дорожим доверием читателей!

Народная воля

ЗАСНАВАЛЬНІК ІОСІФ СЯРЭДЗІЧ

№8 (8)
1 — 8 верасня 1995 г.
Выдаецца на беларускай і рускай мовах
Тыраж 85 000 экз.
Кошт у розніцу — 700 руб.



Газета сверстана на компьютерах "ЛИНТЕК"

Першы дзень вучобы ў школах — наша свята, наша надзея, наша праблема



Настаўніца сярэдняй школы N 49 г.Мінска Вікторыя Лаўрынчык са сваімі другакласніцамі.

Независимая пресса должна быть и свободной, и ответственной

Сегодня в доме творчества писателей "Ислочь" (в районе Ракова) начал свою работу второй Международный конгресс белорусского ПЕН-центра (независимой писательской ассоциации).

В конгрессе принимают участие представители творческой интеллигенции, специалисты, эксперты, правозащитники Беларуси, Болгарии, Великобритании, Канады, Латвии, Литвы, Молдовы, Польши, России, США, Украины, Финляндии, Франции, ФРГ, Чехии, Эстонии. Участники сосредоточили свое внимание на проблемах усовершенствования законодательства и монополизации СМИ в Беларуси, защиты писателей и журналистов от преследований, философии свободы и ответственности прессы.

На Конгрессе впервые будут присуждены литературные премии имени Алеся Адамовича за лучшие работы белорусских авторов в области газетной и телерадиопублицистики. На родине Алеся Адамовича, в поселке Глуша, состоится открытие памятника на его могиле.

Кто — кого?

"Копают" под главного контролера

"Компромат" на председателя Контрольной палаты Республики Беларусь Василия Саковича, по сведениям из достаточно осведомленного источника, искала в Витебске съемочная группа, прибывшая сюда инкогнито. Ее, в частности, интересовал недостроенный коттедж Василия Андреевича, его квартира, в которой сейчас проживает семья дочери и которая якобы предусмотрительно оставлена за ним в городе над Двиной, а также дача в поселке Улановичи. "Киношники", судя по всему, горят желанием рассказать и о столичном жилье Саковича. При этом они, конечно же, преднамеренно забудут упомянуть, что в Минске Василий Андреевич живет в служебной квартире — поменять на какое-то время областной Витебск на столицу пришлось в связи с избранием на пост председателя Контрольной палаты.

Но залетным "киношникам" не до фактов, перед ними поставлена конкретная задача — и они ее решают. Есть данные о том, что вооруженные видеокамерой "разоблачители" прибыли из России, а непосредственное отношение к финансированию "социально-политического заказа" имеет одна крупная торговая структура Минска, у которой, говорят, есть основания быть в обиде на председателя Контрольной палаты.

Не исключено, впрочем, что к этому заказу причастны и государственные деятели (или деятель?), которым хотелось бы видеть на посту "главного контролера" другую фигуру, словом, своего человека.

Но, чтобы "свалить" Саковича, избранного Верховным Советом на определенный законом срок и являющегося республиканским депутатом не только прежнего, но и нового созыва, нужна поистине большая "бомба". Сомнительно, что зафиксированный на пленку "компромат" сможет очень сильно сдетонировать. Ведь сегодня никто и никому не запрещает иметь дачу и строить коттедж. Да и с квартирами у Саковича вроде все по закону.

Кстати, под Саковича активно "копали" уже во время избирательной кампании, может быть, даже эта группа. Тогда из подпольных листовок явствовало, что "главный контролер" перевез всех своих родственников из деревни в Минск и подавал всем квартиры. Избиратели не клюнули на фальшивый крючок: брат Василия Андреевича как работал в колхозе, так и работает, там же трудится трактористом и племянник, мать — сельская пенсионерка. Посмаковав распущенные "друзьями" Саковича сплетни, избиратели отдали все-таки свои голоса именно Василию Андреевичу, хотя в округе на депутатский мандат претендовало еще пять человек.

Чувствуется, не добьются своего "разоблачители" и сейчас. А вот под них "главный контролер" наверняка "накопает".

Борис ДВИНЯТИН.

Так кто же пошутил — Пискарев или Кондратьев? И можно ли по такому поводу шутить?

В парламентских коридорах уже который день интерпретируется выступление на заседании Консультативного совета известного парламентария 12-го созыва Виктора Пискарева. Что же он сказал? Вот запись на магнитофонной пленке:

"Надо в конце концов Верховному Совету высказаться по поводу наскоков в целом на Верховный Совет, на депутатов. Вот эти заявления об иммунитете депутатов. Ну что это за игры идут? С одной стороны заявляют, что есть указ (имеется в виду об изменении такого понятия как депутатская неприкосновенность. — **Ред.**), с другой стороны раздается — нет указа. Да в каком мы государстве живем? Есть так есть, нет так нет. Сегодня встречаю первого заместителя Генерального прокурора, на которого ссылаются: "Владимир, дорогой ты мой Володя, ну разъясни мне, пожалуйста". Ехидно ухмыляется: "Всех депутатов пересадим". Ну сади, пожалуйста, я готов, сумочка с собой. Значит, и мы с самого первого начала, когда начались наскоки на депутатов, мы это проглотили, промолчали и по существу дали повод для дальнейших последовательных шагов, связанных и с компрометацией, и по существу прямым влиянием, воздействием на депутатов. Поэтому и этот вопрос, к сожалению, в повестке дня не значится, не числится. А обстановка, мне думается, не нуждается в особых комментариях..."

Знаем точно: о выступлении уважаемого депутата оповещен первый заместитель Генерального прокурора В.Кондратьев. Знаем и его реакцию: я, мол, такого не говорил, это Виктор Алексеевич пошутил...

Не беремся утверждать, кто же из двоих высоких мужей "пошутил", но обратим внимание: речь идет о серьезных вещах. Если исполнительная власть и правоохранительные органы будут опираться не на законы, а на силу — далеко зайдем.

Евгений КОНОПАЦКИЙ.

Генадзь Карпенка судзіцца з Аляксандрам Лукашэнкам

Відавочна, у чарговы раз прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка атрымае павестку з суда. Цяпер іск яму прад'яўляе дэпутат Вярхоўнага Савета Генадзь Карпенка. Ён патрабуе спагнаць з прэзідэнта два мільярды рублёў за тое, што ён, выступаючы 22 жніўня па Беларускім тэлебачанні, зганьбіў яго гонар, нанёс маральны ўрон.

Перад судом Цэнтральнага раёна г.Мінска стаіць няпростая задача — альбо пацвердзіць словы прэзідэнта, альбо вынесці яму суровае пакаранне. Вядомы ў рэспубліцы парламентарый лічыць заяву А.Лукашэнкі правакацыйнай, скіраванай на дыскрэдытацыю яго як грамадзяніна і дэпутата.

Сапраўды, з вуснаў прэзідэнта зляцела сур'ёзнае абвінавачванне. Той, хто ў той час глядзеў тэлевізар, пачуў: "...Хотел по хлопку сказать следующее. Совсем недавно спецслужба контрразведки обнаружила уже истинных людей, которые препятствовали поставке в Беларусь хлопка. Наши люди, наши политики. Во главе их был известный политик Геннадий Карпенко. Эту фамилию могу назвать впервые..."

Не ведаем, які кампрамат на Г.Карпенку мае А.Лукашэнка, але першы днямі заявіў, што "спецслужбы контрразведкі і духам нічога не ведаюць пра тое, што сказаў прэзідэнт".

Слова — за судом. Два мільярды рублёў — вялікія грошы нават для прэзідэнта.

Барыс СКАКУН.

Што рабіць, калі ваша дзіця не хочуць вучыць па-беларуску

Апошнім месяцам да нас даходзяць трывожныя весткі пра тое, што ў многіх школах, якія на працягу некалькіх гадоў паспяхова навучалі дзяцей па-беларуску, пэўныя работнікі адукацыі сталі або адгаворваць бацькоў запісваць дзяцей у беларускія класы, або палохаць, або проста груба адмаўляцца прымаць заявы. Што рабіць бацькам?

Запішыце прозвішча, імя, пасаду настаўніка, які вядзе прыём дакументаў, а таксама прозвішча і імя дырэктара школы, зноў карэктна папрасіце прыняць заяву і зарэгістраваць яе ў спецыяльным журнале. Гэта ваша канстытуцыйнае права.

Калі вам зноў адмовяць, папрасіце напісаць прычыну адмовы вашай заяве і засведчыць яе подпісам. Калі ж гэтага настаўнік не выканае — патрабуйце, каб гэта зрабілі завуч або дырэктар школы.

Калі, нягледзячы на ўсе намаганні, вам адмаўляюць у прыёме заявы, звяртайцеся за дапамогай па наступных тэлефонах:

г.Мінск:

Заводскі раён:46-98-28, 24-69-13

Ленінскі раён:21-09-24

Маскоўскі раён:71-07-52, 71-95-16

Першамайскі раён:60-12-74 (з 19 да 22 гадзін)

Фрунзенскі раён:50-05-54

Цэнтральны раён:34-07-61, 37-56-12

астатнія раёны Мінска33-50-12.

Іншыя рэгіёны Беларусі:(0172) 33-25-11, 46-46-91, 33-50-12.

Таксама пішыце на адрас: 220034, г.Мінск, вул. Румянцава, 13, ТБМ.

Мікалай КІЙКА, сябра гарадскога бацькоўскага камітэта беларускамоўных класаў і школ г.Мінска, намеснік старшыні ЦК БСДГ.

Кто собирает чемоданы, а кто уже сидит за широким столом

Пока некоторые депутаты Верховного Совета нового созыва еще только собирают чемоданы, предводители Компартии и Аграрной партии, депутаты В.Новиков и С.Шарецкий уже прочно обосновались на седьмом и шестом этажах Дома правительства. Поговаривают, что раздел парламентских этажей будет идти по фракционной системе. Нажимают на такой факт: в России фракцию депутатов-аграрников обслуживает персонал в составе 18 человек. Если взять нынешние комиссии Верховного Совета, то вся обслуга состоит из 3—4 человек.

Леонид ПЕТРОВ.

Министерство статистики сообщает...

Январь — июль: результаты не радуют

Бяднеем, братцы, бяднеем

Вядомая аксіёма: жыццё становіцца больш заможным, калі даходы перавышаюць расходы. На жаль, у нас пакуль што наадварот. Як сведчыць Міністэрства статыстыкі і аналізу, грашовыя даходы, атрыманыя насельніцтвам у студзені—ліпені 1995 года, павялічыліся ў параўнанні са студзенем—ліпенем 1994 года ў 11,8 раза пры росце спажывецкіх цэн у 18 разоў.

Падлічыце самі, на колькі мы бядней сталі жыць?

Цены и тарифы

Сводный индекс потребительских цен на товары и услуги за январь—июль 1995 года по отношению к январю—июлю 1994 года возрос в 18 раз, в том числе на товары — в 17,1 раза, услуги — в 29,1 раза.

За июль потребительские цены на товары и услуги для населения увеличились на 5,2%, в том числе на продовольственные товары — на 0,4, непродовольственные — на 3,6, услуги — на 29,1%. Цены производителей промышленной продукции увеличились на 2,3%, тарифы на перевозку грузов — на 2,4%.

Торгуем ли с заграницей? Еще как!

Объем экспортно-импортных операций за январь—июнь текущего года с государствами Содружества характеризуется следующими данными:

	Экспорт, млрд. руб.	Импорт, млрд. руб.	Удельный вес, %		Удельный вес в товарообороте, %
			экспорт	импорт	
Всего	11850,8	17038,5	100,00	100,00	100,00
Азербайджан	9,1	4,2	0,08	0,02	0,05
Армения	5,1	5,1	0,04	0,03	0,04
Грузия	9,4	5,2	0,08	0,03	0,05
Казахстан	195,4	248,7	1,65	1,46	1,54
Кыргызстан	14,0	14,1	0,12	0,08	0,10
Молдова	277,3	43,4	2,34	0,25	1,11
Россия	8823,0	15554,8	74,45	91,29	84,38
Таджикистан	7,7	5,1	0,06	0,03	0,04
Туркменистан	3,3	2,8	0,03	0,02	0,02
Узбекистан	89,7	139,3	0,76	0,82	0,79
Украина	2416,8	1015,8	20,39	5,97	11,88

Из государств Содружества за январь—июнь текущего года республика получила 2,6 миллиарда киловатт-часов электроэнергии, 346,4 тысячи тонн угля, 178,5 тысячи тонн проката черных металлов, 350,7 тысячи тонн зерна, 8,1 тысячи тонн сахара, 1,9 тысячи тонн шерсти.

Вся нефть и газ импортируются из России. За январь—июнь текущего года поставки нефти составили 5,4 миллиона тонн и возросли по сравнению с соответствующим периодом 1994 года в 1,2 раза, газа — 6,6 миллиарда кубических метров, или 85,5% к уровню января—июня прошлого года.

Уходят преступники от ответственности. А жаль

Помните слова: моя милиция меня бережет. К сожалению, не всегда. Раскрываемость преступлений в январе—июле 1995 года составила 61 процент против 65 в январе—июле 1994 года. Значит, все больше и больше преступников уходит от ответственности. Жаль.

Берегись... сифилиса

В первом полугодии 1995 года зарегистрировано 6127 случаев заболеваний сифилисом и 7563 случая гонореей. По сравнению с первым полугодием прошлого года заболеваемость населения сифилисом увеличилась на 3377 случаев, или в 2,2 раза, гонореей — на 369 случаев, или на 5 процентов.

Самая высокая заболеваемость сифилисом в г.Минске — 107,5 случая в расчете на 100 тысяч человек.

Подпишись сам и подскажи другому!

Подписка на газеты и журналы на IV квартал 1995 года продлена до 10 сентября.

Вы, конечно же, выбрали "Народную волю"? Правильно сделали. С 1 октября она будет выходить как ежедневная газета, на белорусском и русском языках. Повторяем: наш принцип — честность и объективность, наша география — Беларусь и весь мир. Подписавшись на "Народную волю", Вы и Ваша семья будете в курсе всех политических, экономических, культурных, спортивных и других событий. Вам не понадобится искать программу телевидения — она найдет место в каждом номере. Официальные и неофициальные документы президентской администрации, парламента, правительства, юридические консультации, советы по ведению домашнего хозяйства, рекомендации по сохранению и укреплению здоровья, справочная информация, кроссворды, шахматно-шашечные разделы, что предсказывают знаки зодиака — все это и многое другое Вы найдете на страницах республиканской независимой газеты "Народная воля". Заметим, редакция сделала все, чтобы "Народная воля" по цене была одной из самых доступных газет в республике.

Стоимость подписки на один месяц — 12 тысяч рублей, на два — 24 тысячи, на квартал — 36 тысяч рублей. Вам остается заполнить абонементный талон и, не теряя времени, отнести его на почту, в любой подписной пункт. Наш индекс — 63222.

Вы — с "Народной волей", а мы — с Вами!

Редакция газеты "Народная воля".

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **63222** (індэкс выдання)

Народная Воля

Колькасць камплектаў

на 1995 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ________ (паштовы індэкс) ________ (адрас)

Каму ________ (прозвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА

ПВ	месца	літар

на газету **63222** (індэкс выдання)

Народная Воля

Кошт	падпіскі	______ руб.	Колькасць камплектаў	
	пераадрасоўкі	______ руб.		

на 1995 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ________ (паштовы індэкс) ________ (адрас)

Каму ________ (прозвішча, ініцыялы)

Приказано не стрелять

5 августа тысячи охотников ждали с нетерпением. В этот день обычно начинается охота на "перо", что в переводе на официальный язык означает открытие летне-осеннего сезона охоты на пернатую дичь. Соответственно 23 июня 1995 года был подписан совместный приказ Минлесхоза и Минприроды об открытии этого самого сезона именно 5 августа.

Но началась засуха, затем — лесные пожары. И 31 июля в Общество охотников и рыболовов поступает телефонограмма, подписанная представителями Минлесхоза и Минприроды. В ней сообщалось о переносе открытия охотничьего сезона на 19 августа.

Ну что ж, не очень приятно, но в целом понятно. Действительно, пожары, в самом деле, может, лучше переждать несколько дней, а за это время еще разок смазать ружья и проверить патроны.

Но вот близится 19 августа, а это, если вы помните, — суббота. Охотники покупают путевки, за которые приходится платить: разовая от 5 до 20 тысяч, сезонная — от 30 до 250 тысяч белорусских рублей. И, наконец, в пятницу 18 августа народ с ружьями потянулся за город, на водоемы. Кто недалеко от города, а кто и за многие сотни километров, в другие области и районы. Для этого люди специально брали отгулы и отпуска.

Все было бы хорошо, да вот в пятницу после обеда, когда практически все охотники разъехались на заветные места, началась совершенно непонятная история. В то время, когда разбивались палатки, надувались лодки и не кормились собаки, министр МВД шел на прием к президенту. И не знали бедные охотники, что в своем портфеле нес господин Захаренко постановление о переносе открытия сезона охоты на неопределенный срок.

Раскладывая свой скромный полевой паек, не знали славные охотники, что Александр Григорьевич, ими же избранный президент, легкой рукой напишет, что он согласен с тем, чтобы запретить охоту, до особого распоряжения.

Похоже, уже нет в республике вопросов, которые бы остались вне поля зрения президента. И полетели во все исполкомы телефонограммы о том, что за несколько часов до начала охоты президент Лукашенко ее запретил. И ринулись бравые милиционеры и егеря писать протоколы и разгонять охотников с чуть было не начавшейся охоты.

Лишь 22 августа появился совместный приказ Минлесхоза и Минприроды о переносе открытия охотничьего сезона на неопределенный срок. Из-за тех же пожаров. Это кажется довольно странным, что именно по этой причине никак не могут открыть охоту. Во-первых, все члены общества охотников и рыболовов — люди достаточно опытные и смогли бы на местах помочь в локализации и тушении пожаров, что, несомненно, помогло бы пожарникам, которые не в состоянии уследить за всеми очагами возгораний. Во-вторых, охота на птицу проходит на водоемах, где опасность пожаров невелика. Так что можно только строить догадки, что же послужило истинной причиной принятия таких поспешных решений, результатом которых стали потраченные впустую время и деньги охотников. Да и настроение испорчено. Такое впечатление, что это было сделано назло. Но кому и зачем?

Время идет, лето прошло, для многих охота — любимый и единственный вид отдыха, отпуска. Охотники ждут "особых распоряжений". Что будет дальше, неизвестно. Однако для тех, кто уже устал полировать свои ружья, скажу, что до нас дошел обнадеживающий слух: дата назначена на 9 сентября.

Денис ГУРИНОВИЧ, кандидат в охотники и рыболовы.

Панарама жніўня

1. Стаўка на рэформы ці АМОН?

Безумоўна, найбольш прыкметная і не самая станоўчая падзея жніўня — забастоўка работнікаў Мінскага метрапалітэна. У ёй, нібы ў кроплі вады, высвеціўся пэўным чынам правал эканамічнай палітыкі ўлад, іх няўменне дзейнічаць у сучасных умовах — яны, на мой погляд, проста не бачаць выхаду з крызісу.

У абставінах, якія склаліся, варта было б дакапацца разам з усімі зацікаўленымі сіламі да прычын бунту і "запуску" прадпрыемстваў, нарэшце пачаць не на словах, а на справе сапраўдныя рэформы. Менавіта да такога ўзважанага падыходу заклікала Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі. У свім звароце яна настойвала на паскарэнні выканання мер па фінансаваму аздараўленню прадпрыемстваў і павышэнню адказнасці кіраўнікоў за выкананне калектыўна-дагаворных абавязацельстваў. Замест гэтага ўлады прыбеглі да запалохвання і рэпрэсій, ды яшчэ не цывілізаванымі метадамі, а грубым парушэннем законаў, калі проста на вуліцы хапалі прафсаюзных актывістаў, чым настроілі супраць сябе не толькі свой люд, але і сусветную грамадскасць. Высокім чыноўнікам, відаць, не хапіла цвярозага сэнсу задумацца над простымі і важнымі пытаннямі: "А ці хопіць амонаўцаў на ўсе заводы? Хіба эканамічныя праблемы вырашаюцца з дапамогай спецназа і судоў?"

Абвінавачваючы забастоўшчыкаў у парушэнні законаў, высокім асобам варта было б самакрытычна паглядзець і на сябе і задумацца: несвоечасовыя выплаты зарплаты — гэта хіба не парушэнне правоў чалавека, законаў? А хто дазволіў адміністрацыі таго ж метрапалітэна не лічыцца з калектыўным дагаворам?

Відаць, не здольныя ўлады самакрытычна паглядзець на сябе. Таму каго толькі не абвінавачваюць у арганізацыі забастоўкі: і БНФ, і польскія і амерыканскія прафсаюзы, за што атрымалі адлуп ад Дзярждэпартамента ЗША. Пара зразумець, што падобныя наскокі на амерыканцаў могуць прывесці да адмовы крэдытаў і поўнай палітычнай ізаляцыі.

Эканамічныя праблемы вырашаюцца толькі рэформамі і сумленным дыялогам з людзьмі. Да такой думкі ўжо даўно падштурхоўваюць урад, прафсаюзы і гаспадарнікі. Пад іх націскам ён цяпер і пачаў рабіць такі паварот. Нехаця, са скрыпам, ступаючы паўкрокамі.

Заходнія аглядальнікі аднадушны: за тры апошнія гады на Беларусі не зроблена ніводнага прыкметнага кроку на шляху рэформ. Ніводнага! І толькі цяпер прымаюцца першыя захады. Разгледзім іх.

Заслугоўвае ўвагі пастанова Кабінета Міністраў аб мерах па фінансаваму аздараўленню. Яе сутнасць у тым, што для прадпрыемстваў, на якіх востры дэфіцыт абаротных сродкаў і запазычанасць па зарплаце, на жнівень—кастрычнік уводзіцца часовае палажэнне па размеркаванню сродкаў. Згодна з ім, з гэтых прадпрыемстваў будзе забірацца толькі 40% у якасці плацяжоў з агульнай сумы паступленняў.

Несумненна, такая мера паспрыяе калектывам. Але нельга не звярнуць увагу на тэрмін яе дзеяння — толькі тры месяцы. А што потым?

Зразумела, калектывам даецца толькі часовая перадышка ад падатковай пятлі, згаданая мера — спроба толькі адцягнуць рашэнне наспелых праблем і магчымых сацыяльных канфліктаў. Нарэшце, чаму такое рашэнне датычыць толькі тых, хто, як гаворыцца, ужо ляжыць на баку? А тых, хто яшчэ трымаецца, выходзіць, будуць душыць паборамі далей, пакуль і іх "не запусцяць"?

Нельга абысці ўвагай і пастанову Кабінета Міністраў па ўзмацненню барацьбы са злачыннасцю ў сферы экономікі і навядзенню парадку на пунктах пропуску на дзяржаўнай граніцы. У ёй адзначаецца рост эканамічных злачынстваў з-за слабага кантролю праваахоўных органаў і дзяржаўных устаноў. Дапускаюцца парушэнні заканадаўства па ўвозу і вывазу прадукцыі і сыравіны. Міністэрствам і ведамствам дадзены даручэнні выпрацаваць меры па навядзенню парадку, у прыватнасці на граніцы.

Намеры някепскія, своечасовыя. Але і тут узнікаюць даволі цікавыя пытанні: а ці на ўсіх граніцах будзе ўзмоцнены кантроль за ўвозам і вывазам? І на ўсходняй таксама? Але як? Там жа прэзідэнт урачыста выкапаў пагранічны слуп. А асноўны паток грузаў ідзе менавіта на ўсход. Ці, можа, урад лічыць, што на ўсходнім напрамку эканамічныя злачынствы павінны працягвацца?

Хачу звярнуць увагу на пасяджэнне калегіі Кабінета Міністраў у жніўні, на якім разгледжаны праекты законаў, якія датычаць інвестыцыйнай дзейнасці і далейшага развіцця прадпрымальніцтва. На ім прагучала шмат цвярозых думак і прапаноў. Нельга не ўхваліць намеры па прыцягненню замежных інвестараў. Вопыт усіх краін, якія выйшлі з падобных крызісаў, пераканаўча сведчыць, што без прытоку капіталаў з перадавых краін выкараскацца з багны амаль немагчыма. Больш таго, няма нават шансу ўпісацца ў сусветныя эканамічныя структуры. Бо толькі з капіталам перадавых краін прыходзяць сучасная тэхналогія і сучасны вопыт гаспадарання і мыслення. Таму варта толькі вітаць намеры даць шэраг неабходных ільгот для замежных інвестараў, пазбавіць іх шэрагу нашых бюракратычных і падатковых путаў. Але і тут заўважаецца ўсё тая ж палавінчатасць рашэнняў. Няўжо ў Кабінеце Міністраў не разумеюць, што салідных замежных інвестараў адштурхоўваюць не толькі эканамічныя бар'еры, але і палітычная нестабільнасць, парушэнне правоў чалавека і заканадаўства. Таму здзіўляе, што амаль у той самы час, калі выпрацоўвалі меры па прыцягненню замежных інвестараў, адначасова рэпрэсіўнымі мерамі душылі забастоўшчыкаў, чым адразу перакрэслівалі ўсякую надзею на прыток заходніх капіталаў.

Як бачым, урад ніяк не вып'ецца на бальшак рэформаў, бо ў яго няма грунтоўнай праграмы па выхаду з крызісу. Таму яны толькі бясконца паўтараюць, што трэба лепей працаваць, а іх намеры і меры часта напамінаюць вогнетушыцель.

Это было вчера

"Mercedes-Benz" рвется в будущее на белорусской земле

Сначала было приглашение: "Автомобильный дом "Энергия-ГмбХ" — региональное представительство Мерседес-Бенц AG в Республике Беларусь — имеет честь пригласить Вас на презентацию нового семейства автомобилей Е-класса, которая состоится 31 августа 1995 года в 11.00 на территории представительства по адресу: г.Минск, ул.Тимирязева, 68".

Потом, а это значит вчера, был праздник. Самый настоящий праздник. Я не помню, чтобы так торжественно и величественно представляли когда-нибудь юную невесту, как представляли на этот раз в Минске автомобиль "Mercedes-Benz" нового класса "Е". Приглашенная публика, а это не одна сотня человек, то замирала, то проявляла эмоции до высшего предела. Военный оркестр на ходу перестраивался от старого гимна Беларуси до современных ритмов. "Концертное" чествование нового семейства мерседосовских автомобилей проходило под аккомпанемент таких известных звезд эстрады, как Ядвига Поплавская и Александр Тиханович. Ореол славы одной из лучших мировых автофирм воплощали мужская группа "Чистый голос", группа Государственного камерного оркестра Германии, детский фольклорный ансамбль Белорусского радио и телевидения и даже... представители команды Беларуси по легкой атлетике, которая недавно на мировом чемпионате заняла для нас сверхпочетное второе место, уступив лишь спортсменам США.

Понятно, был, конечно, и богатый стол с эмблемой фирмы "Mercedes Benz", оранжированной прекрасными напитками и изысканными блюдами вплоть до копченых поросят.

Чем же заслужили таких почестей автомобили "Mercedes-Benz" нового класса "Е"? Тем, что они новые не только по форме, но и по содержанию. Еще на 6 процентов снижен расход топлива — 6,2 литра на 100 км пути. Четыре новые фары аэродинамической формы. Оптимизированное и наименьшее для серийных автомобилей типа "седан" значение коэффициента аэродинамического сопротивления CW 0,27. Боковые пневмоподушки безопасности для еще более совершенной защиты пассажиров. А общий дизайн — ультрасовременный, привлекательно-притягательный. По словам Гельмута Вернера, председателя совета акционерного общества "Mercedes-Benz AG", новое "лицо" автомобиля класса "Е" символизирует собой прорыв фирмы в будущее.

Прощаясь с устроителями презентации, журналист "Народной воли" полюбопытствовал: "Есть ли покупатели новых мерседесовских автомобилей?" В ответ услышал: "Есть".

Приятно, что такие прекрасные машины будут встречаться на дорогах Беларуси.

Иван ЗАБРОДСКИЙ.

Рынак рве берагі

Столінскі калгасны рынак, які даўно перастаў быць калгасным, напрыканцы лета 1995 ўпершыню за сваю гісторыю "выйшаў з берагоў".

Ніхто не ведае, дзе столінцы бяруць столькі грошай, але тавары імі раскупляюцца імгненна. Нядаўна ў адной толькі вёсцы Альшаны было прададзена за дзень 75 халадзільнікаў.

Цяпер раённы базар захліснулі полчышчы ўкраінскіх чаўнакоў, яго заваліла диванамі Брэсцкае дывановае аб'яднанне, не пакінуўшы месца нават дывану-самалёту. Мінчане вязуць і вязуць сюды халадзільнікі ды маразільнікі, а іх тут усё купляюць і купляюць, як і трыкатаж з Пінска, каўбасу з Моталя, шырспажыў з Польшчы, Турцыі, Кітая...

Базар выліўся на гарадскія вуліцы, адна з якіх — Дзяржынскага — вельмі ажыўленая. Каб утаймаваць стыхію, улады дазволілі гандаль на прылягаючай вуліцы Ключанкова, але і яе не хапае. Спадзявацца засталося хіба што на гарадскі стадыён.

Між іншым Столінскі рынак шырыцца не толькі ў прасторы, але і ў часе. Да нядзелі дабавіцца серада. А кожны базарны дзень папаўняе бюджэт раёна больш чым на пяць мільёнаў рублёў.

Мікалай ІВАНАЧКІН.

Роздум настаўніка

II. Бедная школа

Ці трэба вынаходзіць ровар?

Сёлетнія ўступныя іспыты ў ВНУ паказалі, што масавая школа вучыць кепска. Строгі падыход да ведаў абітурыентаў прывёў да недабору на некаторыя факультэты. Хто зойме вакантныя студэнцкія месцы, на якія не трапілі "сялянска-пралетарскія дзеці"? Мусіць, тыя, хто можа заплаціць за вучобу 600 долараў. Як падсмяяўся адзін навaспечаны студэнт, Лукашэнка сёлета зэканоміць на бюджэце вышэйшай школы. Зрэшты, на адукацыі ў СССР і ў Беларусі заўсёды эканомілі. Бывалі, праўда, і адступленні.

Камуністычная партыя і савецкі ўрад яшчэ ў 70-я гг. ускосна прызналі, што школа вучыць кепска. Для таго, каб неяк палепшыць справу, ВНУ дазволілі адчыняць падрыхтоўчыя факультэты і аддзяленні са стыпендыяй слухачам. На гэта грошай хапала. Для таго ж, каб паменшыць нагрузку настаўнікаў ці павялічыць ім зарплату, грошай, зноў жа, не было.

Парадокс тлумачыцца вельмі проста. КПСС і ўрад зрабілі выснову з маладзёжных выступленняў у Францыі і некаторых іншых краін, на чале якіх стаялі студэнты. На падрыхтоўчыя факультэты (аддзяленні) бралі тых, хто не вельмі добра і старанна вучыўся ў школе, але паслужыў у войску. Павучыўшыся год і здаўшы хоць на "тройкі" іспыты, студэнцкі кантынгент папаўнялі "загартаваныя жыццём" і навучаныя айцамі камандзірамі і паліт-работнікамі сяржанты, яфрэйтары і радавыя запасу. Малодшыя камандзіры станавіліся старастамі, камсоргамі, партгрупоргамі і г.д. Нямногія з іх вучыліся пасапраўднаму. Учарашнія выпускнікі школ апынуліся ў няроўным становішчы з імі. Затое яны паспяхова засвойвалі армейскі сленг.

Вышэйшая школа таксама дэградзіравала, асабліва гуманітарныя факультэты. Па маіх назіраннях, гісторыя СССР і гісторыя КПСС у ВНУ на працэнтаў 15 была паўтарэннем школьнага курсу. На некаторых факультэтах і аддзяленнях праходзілі такія "азбучныя" дысцыпліны, як уводзіны ў мовазнаўства, уводзіны ў філасофію і г.д. Гісторыкі, філолагі, юрысты, журналісты вывучалі логіку прыблізна на ўзроўні царскай гімназіі, а веданне лацінскай мовы не адпавядала патрабаванням царскай гімназіі і блізка. Старажытнагрэчаскую у Беларусі наогул не вывучалі. У выніку са сцен ВНУ выходзілі настаўнікі гісторыі, беларускай і рускай моў, якія не ведалі лаціны, старажытнагрэчаскай і хоць бы адной германскай ці раманскай мовы. Ды што казаць пра настаўнікаў, калі без ведання гэтага абавязковага колісь мінімуму пры савецкай уладзе можна было стаць доктарам філалагічных, гістарычных, юрыдычных або філасофскіх навук. Затое яны ведалі "генеральную лінію" і маглі разважаць аб партыйнасці навукі.

Зрэшты, амаль пра ўсё, пра што гаворка ідзе ў папярэднім абзацы, я павінен пісаць не ў мінулым, а ў цяперашнім часе, не забываючы, праўда, пра выключэнні.

Камуністычная партыя і савецкі ўрад ніколі не разглядалі школу як мэту, але заўсёды як сродак. Сродак "камуністычнага выхавання", "патрыятычнага выхавання", "працоўнага выхавання" і г.д. Вядома, абвяшчалася, што задача савецкай школы — даць магчымасці для гарманічнага развіцця асобы. Але гэта было даволі дзіўнае "гарманічнае развіццё" — без уліку здольнасцей і схільнасцей дзяцей і жадання бацькоў. Для ўсіх аднолькавыя падручнікі, аднолькавыя праграмы, вытрыманыя "ў духу". Пэўныя адступленні дазваляліся толькі для школ "з ухіламі". Але "дух" вытрымліваўся і тут.

Між тым педагагічная і ўзроставая псіхалогія даводзіць, што схільнасці ў дзяцей выяўляюцца даволі рана, а здольнасці да тых ці іншых навук фарміруюцца, як правіла, да 15-гадовага ўзросту. Гэта наша афіцыйная педагогіка ведала, аднак памяняць сістэму адукацыі не магла. Тлумачылася ўсё вельмі проста: няма грошай, не хапае грошай. На ракеты і Афганістан ёсць, на дапамогу Кубе, Мазамбіку і Анголе хапае, на ўдасканаленне сістэмы адукацыі — няма.

Ажыццявіць палажэнні Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека пра тое, што "бацькі маюць права... выбару віду адукацыі для сваіх малалетніх дзяцей", і пра тое, што "адукацыя павінна быць накіравана на поўнае развіццё чалавечай асобы і на павелічэнне павагі да правоў чалавека і асноўных свабод", стала магчыма тады, калі пахіснулася ўсеўладдзе КПСС.

Сярод педагогаў знайшліся энтузіясты. Адчыніліся першыя гімназіі і ліцэі. У вучэбных планах сярэдніх навучальных устаноў з'явіліся такія дысцыпліны як рэлігіязнаўства, правы чалавека, паліталогія, уводзіны ў філасофію, логіка, рыторыка, уводзіны ў псіхалогію, асновы эканамічных ведаў, лацінская, старажытнагрэчаская і заходнеславянскія мовы, гісторыя культуры, культуралогія... Упершыню бацькі атрымалі права выбару відаў адукацыі.

Тут нельга не згадаць добрым словам былых міністраў адукацыі Міхаіла Дземчука і Віктара Гайсёнка, якія далі "зялёнае святло" гэтым тыпам школ. Дый Вячаслава Кебіча нельга не ўспомніць, бо менавіта пры яго прэм'ерстве ўрад зацвердзіў палажэнні пра ліцэі, гімназіі, каледжы.

Галоўнае, што было зроблена: найбольш здольныя дзеці займелі магчымасць атрымаць больш глыбокія веды па тых ці іншых дысцыплінах, лепш падрыхтавацца да вучобы ў ВНУ. У ліцэях, напрыклад, у клас дазволена набіраць не больш за дваццаць вучняў. Такім чынам, настаўнікі атрымалі магчымасць "дайсці да кожнага". Паглыблена вывучаюцца мовы, іншыя прадметы.

Настаўнікі гімназій і ліцэяў атрымліваюць не больш за сваіх калег у агульнаадукацыйнай школе, але тут яны могуць цалкам перадаць дзецям свае веды. Гэта, як правіла, людзі творчыя. Ім даводзілася і даводзіцца самім распрацоўваць праграмы і курсы, складаць навучальныя тэксты для дзяцей. У свой час, калі мелі-ся зацвярджаць палажэнні аб ліцэях, гімназіях і коледжах, была прапанова зменшыць нагрузку такім выкладчыкам. Аднак у Міністэрстве фінансаў растлумачылі, што няма грошай.

Гімназіі, ліцэі і коледжы называюць навучальнымі ўстановамі новага тыпу. Казаць так — значыць вынаходзіць нанава ровар. У гімназій і ліцэяў ужо самі назвы старыя (праўда, колішні калегіум, калегію сталі на англійскі лад называць коледжам). Адбываецца вяртанне да правераных формаў навучання з адборам дзяцей, з правам іх выключэння за недастатковыя поспехі. Новае — у змесце навучання ды ў тым, што ёсць тэхнічныя сродкі навучання. Як і даўней, ліцэісты і гімназісты павінны атрымліваць грунтоўную адукацыю, каб без асаблівых праблем паступаць у ВНУ.

У ліцэі і гімназіі тыпу школ прыйшлі выкладчыкі ВНУ і супрацоўнікі акадэмічных інстытутаў з навуковымі ступенямі. І большасць з іх не расчароўваецца, бо дзеці, як правіла, прыходзяць дзеля вучобы, а не для таго, каб адседжваць урокі. У Бараўлянскай гімназіі дзевяцікласнікі не лянуюцца вывучаць і англійскую, і французскую мовы, і псіхалогію, і прыкладную эканоміку; у мінскай беларускай нацыянальнай гімназіі N 198 — логіку, рыторыку, польскую мову і спецкурс па фізіцы.

Самая жудасная карціна назіраецца тады, калі нейкага вучня трэба адлічыць з-за таго, што ён не спраўляецца з праграмай. Дзіця плача, не хоча назад у масавую школу, бо ў гімназіях і ліцэях іншая атмасфера: тут, як правіла, да вучня звяртаюцца на "вы", паважаюць яго асобу і думку. У тым ліцэі, дзе працую я, за чатыры гады толькі раз вучань не гуляючы, а са злосным намерам ударыў другога вучня. Праўда, бывае, што бацькі самі забіраюць сваіх дзяцей, бо на першым часе не заўсёды пацвярджаюцца школьныя "пяцёркі" і "чацвёркі", а некаторыя мамы і таты лічаць, што галоўнае — адзнакі ў атэстаце.

Паўстае пытанне: чаму не стварыць такіх школ як мага больш? Іх нельга ствараць шмат. А калі і стварыць, дык не ўсе яны пройдуць даволі строгую дзяржаўную атэстацыю.

Каб стварыць такія школы, патрэбны перш за ўсё педагагічныя кадры. Ці ў кожным раёне і горадзе ёсць настаўнікі, якія ведаюць логіку, рыторыку, паліталогію, рэлігіязнаўства, псіхалогію, культуралогію і могуць іх выкладаць? Пра лацінскую ці старажытнагрэчаскую мовы памаўчу. Другое пытанне: колькі можна стварыць ліцэяў і гімназій у невялікім раёне (Ганцавіцкім, Клецкім)? Максімум адну. Але каб туды маглі трапіць і там маглі вучыцца дзеці з усяго раёна, неабходна пабудаваць прыстойны інтэрнат і забяспечыць вучням прыстойнае харчаванне і прыстойнае выхаванне. А дзе ўзяць грошы на ўсё гэта? Сельскай школе наканавана адставаць ад гарадской. Ліцэі і гімназіі пры ВНУ — паліятыў: не кожная маці адважыцца адправіць 15-гадовага падлетка "у далёкі свет", дый колькі тых ліцэяў і гімназій можна адчыніць? Не больш, чым ВНУ.

Ліцэісты і гімназісты мэтанакіравана рыхтуюцца да вучобы па пэўнай спецыяльнасці. Ужо цяпер выкладчыкі ВНУ адзначаюць перапады ў адукацыйнай падрыхтоўцы студэнтаў. Скажам, на філасофскі факультэт прыходзяць маладыя людзі з веданнем асноў логікі, пэўнымі ведамі пра гісторыю філасофіі і яе праблематыку, і людзі, якія вучыліся ў масавай школе і ўсяго гэтага не чулі. Што рабіць выкладчыкам? Што рабіць выкладчынкам аддзялення класічных моў, калі адны першакурснікі ўжо два гады вывучалі лацінскую мову, а другія ведаюць толькі лацінскі алфавіт? У невялікіх студэнцкіх групах (а ў БДУ гэта, акрамя філосафаў і "класікаў", яшчэ псіхолагі, сацыёлагі, паліталагі, эканамісты-тэарэтыкі, культуролагі) атрымліваецца разнабой, цяжка выпрацаваць адзіны падыход да аўдыторыі. Адным студэнтам даводзіцца паўтараць, а другім тлумачыць азы. Дзяліць гэтыя групы на падгрупы не дазваляюць: зноў-такі, не хапае грошай. Іншага выйсця, як уводзіць чацвёрты ўступны іспыт (па спецыяльнасці), няма. Не прымаюць жа на матфак тых, хто не ведае матэматыкі, а на гістфак — тых, хто не ведае гісторыі.

Дарэчы, пры такой сістэме былі б выпрацаваны адзіныя праграмы па "новых" дысцыплінах. Пакуль што іх няма. Настаўнікі ліцэяў і гімназій самі вызначаюць, што выкладаць па паліталогіі, псіхалогіі ды іншых нетрадыцыйных у нашай школе навуках.

Відавочна, што канцэпцыя адукацыі, пераемнасці паміж сярэдняй і вышэйшай школай патрабуе ўдакладнення. Педагогі працуюць над гэтым. Але педагогам, як заўсёды, замінаюць палітыкі, якія ні дня не працавалі ў школе і тым не менш заяўляюць, што яны самі чытаюць усе падручнікі, выказваюць сваё "аўтарытэтнае" меркаванне па зместу навучання.

Ужо прагучала заява пра тое, што, маўляў, някепска, было б вярнуцца да праграм узору 1985 года. А як тады быць з цытаванымі тут палажэннямі Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека? Ці Беларусь не падпісвала яе? А як быць з адзінай адукацыйнай прасторай Беларусі і Расіі? У Расіі ўжо выдадзены падручнікі логікі і рыторыкі, ёсць дапаможнікі па паліталогіі, міфалогіі, іншых дысцыплінах. Ёсць спецыяльны курс і дапаможнік "Правы чалавека". Беларусь у справе выдання такіх дапаможнікаў адстала ад Расіі. Ці то зноў грошай не хапае, ці то камусьці вельмі карціць сапраўды вярнуцца да праграм 1985 года. Але калі вяртацца да тых праграм, дык "шкодныя" расійскія падручнікі давядзецца спаліць ці то пусціць пад нож. Карацей, гэта была заява чалавека, які не зусім добра ведае стан сучаснай школы ў вельмі паважанай ім краіне.

На сённяшні дзень школа ў Беларусі бедная. Бедная таму, што ёй заўсёды не хапае грошай, і таму, што ёю кіруюць па старой кампартыйнай завядзёнцы: новы генеральны сакратар — новая рэформа, новая праграма. Школа па-ранейшаму сродак. У Расіі прэзідэнт не дазваляе сабе выказванняў ані аб падручніках, ані аб праграмах. Ен, мусіць, ужо засвоіў, што школа павінна вучыць праўдзе, жыць па праўдзе, сеяць сапраўды разумнае, добрае, вечнае, а не тое, што патрэбна ў гэтую хвіліну гэтай уладзе.

Анатоль СІДАРЭВІЧ, настаўнік.

Спят индусы на траве Беларуси

Если вы не были часов в пять утра в районе Минского железнодорожного вокзала, — расскажу, что я там видел. В привокзальных скверах и кустиках — сонное царство. Прямо на траве, подложив картонки и укрывшись тряпьем, спят десятки людей. Мужчины, женщины, дети. Особенно жутко видеть детишек, раскрывшихся во сне, и их еле двигающуюся мать, которая из последних сил пытается спасти их от холодного августовского утра. А ведь скоро станет еще холоднее, а там и вовсе зима...

Судя по их облику, это жители Азии, в общем — "индусы", как зовут в просторечии. Беларусь для них — коридор в Европу, где они ищут лучшей доли. Пусть себе ищут, это их право. Но ведь существуют и общепринятые цивилизованные правила пересечения границ суверенных государств. Кто разрешил толпам "индусов" следовать через нашу границу? Как они доехали до Минска? Куда поедут дальше? Сколько их? Кто их контролирует, направляет, опекает? Кто, наконец, выгнал их из вокзала на улицу и почему выгнал? Или наши власти задумаются над этими вопросами только тогда, когда азиатские мигранты заполонят не только наши парки, но и подъезды, чердаки, подвалы?..

Николай ГОРЧАК.

Полоцкие власти постеснялись Таисии Вольвачевой?

До слез обиделась на местную власть жительница Полоцка, инвалид, бывшая малолетняя узница фашистского концлагеря Таисия Вольвачева.

Узнав о том, что в западногерманском городе Ветцларе находятся могилы отчима Таисии и ее сестры, погибших во время войны, активистка немецко-белорусских культурных связей, преподавательница музыки госпожа Урсула Хайнеке и витебский поэт Владимир Попкович привезли в Полоцк землю с кладбища, где покоятся родственники Вольвачевой. Но, по словам Таисии Тимофеевны, "отцы" города Полоцка воспрепятствовали ее встрече с гостями и предложили им отдать реликвию в музей, откуда бывшей узнице позвонили тогда, когда Хайнеке и Попкович уехали.

Огорченная тем, что не смогла лично поблагодарить добрых людей, Вольвачева считает: "Может, им (городским властям. — **Авт.**) было стыдно, что я живу в бараке, построенном пленными немцами?"

О своей обиде больная женщина сообщила в областную газету "Народнае слова".

Борис ДВИНЯТИН.

Прафсаюзы судзяцца з уладамі

Старшыня Свабоднага прафсаюза Магілёўскага малочнага камбіната Сяргей Іваноў лічыць, што супраць членаў яго арганізацый разгорнута рэпрэсійная кампанія. Каб абараніць незаконна звольненых людзей, прыходзіцца весці шмат судовых спраў. Напрыклад, зараз у магілёўскім судзе знаходзіцца іскавая заява да адміністрацыі малочнага камбіната, бо рабочым аднаго з цэхаў не выплачваецца законная прэмія амаль што 3 гады. У Бабруйску, на АТ "Фандок" адміністрацыя ўжо на працягу двух гадоў адмаўляецца заключыць са Свабодным прафсаюзам звычайны калектыўны дагавор. Звароты ў Дзяржаўную інспекцыю па працы, да ўлад і пракуратуры не даюць вынікаў.

Зыходзячы з гэтых фактаў, кіраўніцтва СП Магілёўшчыны зрабіла выснову аб жорсткай дыскрымінацыі сваёй арганізацыі з боку работадаўцаў пры маўклівым патуранні і мясцовай, і вышэйшай улад.

Аліна МІНІНА.

Встать! Суд идет!

...Эти странные записи в блокноте

В его блокноте нашли странные записи. Да и весь блокнот более чем странный. В нем рисунки с изображением фашистских символов, строки о Гитлере, чертежи оружия и его узлов.

И записи. Вот эти (орфография и стиль сохранены. — **Ред.**): "Акцентировать внимание на внезапное нападение на квартиру... Машины останавливать на шоссе перефирии... В лицо прыскать дихлофоса... Нет трупа — нет убийства... Завести дела на лиц с имеющимися компрометирующими данными, на пленку голос записать... Подготовить текст присяги, церемонию целования знамени... Мундиры, нескольких видов формы..."

Что бы они значили? Советую подумать об этом после прочтения статьи. А пока расскажу о том, как и почему этот блокнот попал в руки милиции.

Олегу казалось, что он все продумал до мелочей. В шесть утра позвонил знакомому Вадиму (имена изменены, поскольку дело еще, возможно, будет рассматриваться в более высоких судебных инстанциях). Попросил подъехать к его дому к 10 часам. При этом пообещал: "Отдам тебе долларовые купюры за "народные". Он знал слабость Вадима. И то, что тот только что сбыл машину, которую "пригнал издалека".

В назначенное время дружок сидел на диване у Олега. Гость с гордостью достал пачку стодолларовых купюр, из рюкзака — пачки российских денег. Начал отсчитывать последние за долларовую купюру Олега. Хозяин в это время подошел к гостю сзади, взял из тумбочки пистолет и дважды выстрелил в затылок Вадиму...

Пистолет он сделал сам. Сначала испытал на ведре. Первая пуля оставила лишь вмятину. После доводки пистолет отлично дырявил ведро. Вот и сейчас он сработал отменно. Дружок сразу повалился на диван.

Олег зашел на кухню, выпил два стакана водки. Подбил бабки. Из карманов Вадима вытряс 1700 долларов, 530 марок ФРГ, полтора миллиона российских рублей, полмиллиона белорусских... Труп затащил в ванную. С помощью топора и ножа разделал его.

Затем завернул части тела в газеты, расфасовал в целлофановые кулечки и выбросил их в мусорные ящики по улицам Якуба Коласа, Белинского, Волгоградской, Кольцова... Заскочил к другу Игорю:

— Слушай, выручай. Отгони машину от моего дома на стоянку. А то я, видишь, под градусом.

А когда тот вернулся, похвастался пистолетом, который смастерил сам. И попросил:

— Припрячь, а то не зарегистрируешь ведь такое... Потом поучимся попалить... И никому ни гу-гу.

Вещи убитого и свои облил бензином и сжег. Переехал пожить к знакомой, а дома затеял ремонт. Поменял ванную, побелил потолки, покрасил полы...

Но однажды, идя в гастроном, буквально оторопел: на витрине увидел снимок головы Вадима и обращение милиции к населению сообщить все, что известно об этом человека и его знакомых. У него екнуло сердце...

И не зря... Кто-то из сборщиков мусора заметил один из пакетиков, подброшенных Олегом. Сообщил в милицию. Начали потрошить все мусорки. И отыскали некоторые части тела. Судебным экспертам были предъявлены голова, левое плечо, предплечье, правое плечо, таз, правое бедро, левая голень, стопы, куски мягких тканей грудной клетки. Остальное отыскать не удалось.

Но и это дало много информации. А с помощью звонивших удалось установить личность убитого и имена многих его знакомых.

Свидетели, его близкие друзья, сообщили, что утром должны были встретиться с Вадимом. Он обещал привезти деньги для обмена, а затем заняться продажей автомобиля. Но не появился. Начали звонить родным. А те с тревогой говорят: пропал где-то...

Круг поиска сужался.

Олег тратил деньги на вещи и импортное пиво. Купил телевизор, видеомагнитофон, кожаную куртку.

Обыск на его квартире, несмотря на ремонт, тоже дал результат. Нашли бурые сгустки на подставке под умывальником — кровь, как выяснилось, убитого.

Эта история, как и сотни других, убеждает, что преступлений без следов не бывает. И показывает, к какому падению приводит жадность, жажда обогащения любой ценой. Чужая кровь никогда не смывается, и за нее всегда придется отвечать.

А теперь вернемся к записям в блокноте. Мы видим, что их автор пытался осуществить идею лишь одной строки: "Нет трупа — нет убийства". А если бы взялся за остальные — за составление списка лиц, за сколачивание команды единомышленников с принятием присяги, целованием знамени и своей формой?..

Судебная психолого-психиатрическая экспертиза сделала любопытное заключение. Нет, он не шизофреник. С подросткового возраста у него развились такие черты, как властолюбие, эгоцентризм, склонность к агрессивным типам реагирования... Интеллект его развит хорошо.

Так что ему вполне по силам выполнение всех записей-планов в блокноте. Вплоть до нашивок фашистской символики.

Один ли он такой? Увы, оперативники знают немало подобных. Страшный дух витает в воздухе нашего общества. Расчленение трупа в ванной, о котором я рассказал, лишь репетиция крутых мальчиков, готовящихся к своей будущей деятельности.

Что сделать, чтобы эта репетиция была последней? Чтобы в человеке всегда возобладало только человеческое?

Задумаемся все...

Степан КОЗАКЕВИЧ.

Из дневника писателя Анатолия КОЗЛОВИЧА

Мы и землетрясение

Одно время я загорелся написать книгу об уличных деревенских кличках. Уверен, это одна из пышных ветвей народного творчества. Почти у каждого человека имеется реальное параллельное имя — не по гороскопу, а по наблюдению людей. За каждой кличкой — точнейшая мотивировка: черта характера (плохая или хорошая), поступок (дурной или славный), событие (которое подсветило человека). Бывает, человек так привыкает к своему нажитому имени, что отзывается только на него. Не обижается, что не зовут по паспорту. Как там его по паспорту — мало кто и знает. Бывает, даже жена забыла.

Несколько документальных новелл, повествующих о рождении и функционировании кличек, я написал и опубликовал в газете. Встретившись после около писательского действа с реальными героями, я не узнал их. Их лица исказила ненависть ко мне.

Но чем, земляки, я вас обидел? Вас кличут именно так — и вы откликаетесь!

А ты, писатель хренов, выставил меня перед миром, как последнюю шишку. Ты что, не знаешь, как мое имя? Наврал в газете и еще деньги получил.

Доказывать, что я отразил, как говорится, объективную реальность, не стал. Чтобы сохранить отношения с дорогими мне людьми, бросил начатую книгу о деревенских кличках, никогда не упоминаю о них в печатном виде. Тема, убедился я, весьма сложная, глубокая.

Не однажды видел: прочитав про себя в газете, человек испытывает потрясение. Так трясет землю стихия, изменяя ландшафт. Газета может вызвать землетрясение души. Посему назвать газету зеркалом, как это принято, не решаюсь. Это невероятностное сравнение, не учитывающее существования зазеркалья. Обида человека на кличку — вот глубинные корни зазеркалья, связывающие человека с другими людьми в единый организм.

Итак, газета, а в ее лице прочие СМИ, по силе воздействия сравнимы с природными явлениями. Продолжим растить метафору, вернемся к упомянутому землетрясению.

Жутко смотреть на селение, разваленное землетрясением, и знать, что под грудами бывших домов — люди, уже умершие или умирающие в эту минуту. Боль и сострадание непременно переплетаются в вопрос: неужто они не знали? Засыпая живыми-здоровыми, все укладывались в себя, в звезды, сливаясь с твердью, водой и небом, соединенные посредством пола, потолка, стен, фундамента со всем мирозданием, — не почувствовали предупредительный сигнал? Неясную тревогу, либо озноб, либо головокружение, либо свечение в глазах?..

Нет. Все они заснули, не получив информации о беде, которая стояла в изголовье.

Информация была их единственным спасением, но к ним не пришла, как пришла к зверям, птицам, паукам, разным ползучим гадам.

В Казахстане, под Алма-Атой, лет двадцать назад действовал заповедник, где ученые изучали поведение фауны накануне землетрясения. Менялись все: прыгучие сайгаки, уродливые ящерицы, ядовитые скорпионы, юркие мышки, вредные гадюки, безвредные ужи, даже осы жужжали по-особому...

Этих сайгаков, ящериц, скорпионов, мышей, гадюк, ужей, ос и прочая, прочая следовало бы назвать носителями и поставщиками информации. Журналистами от природы, а не от лукавого. Каждая особь несла личную информацию, свою правду, которая, сливаясь воедино, превращалась в разностороннюю (плюралистичную) информацию о том, как жить и выжить человеку, человечеству, цивилизации. Ну и, понятно, фауне.

Чтобы выжить, всем надо двигаться в одном направлении, выработанном всем предшествующим развитием мира. В силу природных особенностей один будет в том направлении ползти, другой — бежать, третий — лететь... Вот суть плюрализма в переходный период, который подобен землетрясению, цунами.

Лебедь, рак и щука — особи от природы плюралистичны, однако в переходный период инстинкт самосохранения подскажет им, что надо делать. Так же, как подсказал обитателям Алма-Атинского заповедника, этим органичным журналистам, информирующим о беде всех и вся, в том числе людей.

Если поведение информаторов передать видеорядом, получится телевидение; а если пересказать — газета. Осталось найти Главного редактора — Яковлева, Середича — и зарегистрировать СМИ.

Смотрите, читайте. Потребляйте информацию исключительного качества, доставленную журналистами высшей пробы.

Однако названный заповедник взяли и закрыли. Видимо, на естественном пути фауны, желающей жить, встал непредсказуемый представитель, некий суслик-командир, утративший связь с землей и небом, и заповедал: землетрясения не будет, возвращайтесь в свои норы и гнезда!

Примерно по такому сценарию закрываются в Беларуси средства массовой информации — радиопередачи, телепрограммы, газеты. Чтобы закрыть, ищут суслика.

Конечно, с закрытием заповедника жизнь природы не прекращается. Поведение фауны осталось естественным. Прекратилось лишь поступление к людям правдивой информации. Спасительной. И началось производство и распространение информации ложной, сусликовой. Убийственной.

Суслик нужен, чтобы свои воззрения оформить в виде собственного СМИ. Чтобы антиинформацией ослепить, оглушить, отравить, оглупить. Ликвидировать нормальные функции здорового организма. Не продохнешь под и вид, а президента под обломками.

Суслики от СМИ бывают большими и маленькими. Самый большой, безусловно, президент либо король, либо премьер (как у кого).

Феномен нашего президента в том, что он самолично придумал себе кличку — Батька, а затем обиделся, увидев ее в газете. Так что, коллеги, кличку лучше не применять, по пустякам президента не злить, смотреть глубже.

Глубинная суть не в кличке. Президент как человек деревенский обиделся законно. Суть — в стремлении президента к знаковым поступкам, которые наравне с геологическими процессами. Например, остановить землетрясение в Минском метрополитене, то есть забастовку, не акцентируя внимания на истинных причинах недовольства людей.

У нас в Беларуси забастовку, какую бы мотивацию она ни носила, принято осуждать, клеймить позором. Хотя забастовка, по цивилизованным канонам, — естественная реакция нормального человека на бесчинства властей. Для властей же естественно предвидеть забастовочную напряженность, опередить, судить, посадить в тюрьму.

Он-де, машинист наглый, получает в три-четыре раза больше президента и, видите ли, хочет еще больше!

Так сказал президент, не сказав многого другого. Когда произносил, представительский костюм на нем повторял его гневные жесты, новый галстук то и дело наплывал в зеркале, в которое только что смотрелся президент, богатая заколка в лучах телеэкрана блестела солнышком.

Есть ли в стране Беларусь хоть один ненормальный человек, который верит, что президент живет на один миллион белорусских "зайчиков"? Знаете, есть, но это суслики.

У них, сусликов, своя иерархия. Во все СМИ Суслик (пишем эту кличку с большой буквы) послал своих маленьких наместников. Маленькие, но полностью. Хором прокричали, что землетрясение — незаконно, аморально. И ни слова о том, что у большого коллектива есть все же повод для недовольства.

Между тем землетрясение нигде не исключено. Даже в Беларуси. Ученые утверждают, что землетрясения до трех баллов в Беларуси происходят ежегодно по нескольку раз.

Скажите мне, какие газеты вы читаете, — я предскажу, что будет с вами завтра.

P.S. Сусликов из-под Алма-Аты прошу не обижаться на метафору. Я имел в виду не вас конкретно, вы — журналисты настоящие. Что касается белорусских "сусликов", то называть всех поименно-попастырно я посчитал излишним. Я веду уверенно, что ни один присмышленый человек в процессе его жизнедеятельности, сообщает суть человека, словно знак зодиака. Так что все, о ком тут прозрачный намек, появились на свет, надо полагать, под созвездием Суслика. Такого в небесах не существует? А вы вглядитесь в небо Беларуси, посылающее нам издевательский смешок...

Мечыслаў Грыб цяпер не першы

На аўтамабілях першай асобы Вярхоўнага Савета нумары пачынаюцца з лічбы 01. Так было да апошняга часу. Цяпер на нумарных знаках машын спікера спачатку стаіць лічба 02. З лічбы 01 пачынаюцца нумары аўтамабіляў, якія стаяць у прэзідэнцкім гаражы.

Мікалай КРАВЕЦ.

Прэм'ер-міністру Рэспублікі Беларусь сп.М.М.Чыгіру

Дазвольце нам маліцца, як мы хочам

Шануючы дадзеную Вам уладу, выказваем сваё засмучэнне і шкадаванне з нагоды зацвярджэння Палажэння аб парадку запрашэння і дзейнасці замежных святароў на тэрыторыі Беларусі.

Мы, хрысціяне рыма-каталікі г.Бабруйска лічым, што дадзенае палажэнне не ўлічвае праблемы, якія існуюць у рымска-каталіцкай царквы на Беларусі — 3, 4, 9 пункты Палажэння пагарджаюць намі як людзьмі, вызнаўцамі хрысціянскай веры праз прыналежнасць да рымска-каталіцкай царквы. Выразна праглядаецца парушэнне нашых правоў, гарантаваных арт. 3,4 (23) Закона "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях", арт. 16 Канстытуцыі.

Вы не можаце не ведаць, якім чынам наша дзяржава абышлася з дзесяткамі беларускіх ксяндзоў у недалёкім мінулым. У выніку вынішчэння, высылак, праследаванняў у Беларусі захаваліся лічаныя святары рымска-каталіцкага веравызнання. Каб з'явіліся, вывучыліся свае, беларускія, ксяндзы, патрэбен час, руплівая місійная дзейнасць сярод прыхаджанаў — гэта працэс досыць сур'ёзны і складаны. Таму рымска-каталіцкая царква змушана ў значнай частцы прыходаў, у тым ліку і ў Бабруйску, выкарыстоўваць з ласкі ахвярнай працы ксяндзоў з іншых краін. Каб задаволіць рэлігійныя патрэбы хрысціян рымска-каталікаў, ксяндзу патрэбна весці нармальную, гарманічную і паўнацэнную дзейнасць, неабходны сфарміраваныя і падрыхтаваныя для місійнай дзейнасці сёстры-манашкі, місіянеры і катэхізісты — усе тыя асобы, якія ўтвараюць інстытуты дзейнасці рымска-каталіцкай царквы з часоў яе існавання.

Вядома, што большасць каталіцкіх храмаў на тэрыторыі Беларусі былі знявечаныя альбо разбураныя. Таксама і ў Бабруйску, які ў пэўны час з'яўляўся дэканатам, у склад якога ўваходзіла каля дзесяці парафій.

Пры наяўнасці вышэйазначаных абставін, у не маючых ксяндза зарэгістраваных абшчынах, задавальненне рэлігійных патрэб павінен выконваць ксёндз, прыход якога мяжуе з мясцовасцямі пражывання вернікаў дадзеных абшчын. Гэта з'яўляецца неабходнай місійнай дзейнасцю святара як пастыра, але ўваходзіць у супярэчнасць з п.4 існуючага Палажэння. На жаль, п.3 увогуле працяг тэрміну знаходжання святара на месцы ставіць у неабмежаваную залежнасць ад волі чыноўніка. У статуце рымска-каталіцкай царквы права прызначэння альбо адклікання ксяндза належыць біскупу і з'яўляецца ўнутранай справай царквы, роўнасць якой перад законам гарантавана арт. 16 Канстытуцыі.

Вас як галаву выканаўчай улады мы просім не пакідаць нас без гарантыі адпраўлення намі нашых рэлігійных абавязкаў і патрэб.

Шаноўны прэм'ер-міністр, сардэчна просім Вас перагледзець Палажэнне аб парадку запрашэння і дзейнасці замежных святароў на тэрыторыі Беларусі, асабліва пункты 3, 4, 9, бо яны зневажаюць нас як вернікаў і грамадзян Беларусі.

З пашанай і малітвай за Вас рыма-каталікі прыхода Св. ап. Пятра і Паўла г.Бабруйска. Жыбартовіч Е.К., Ждановіч Т.Л., Паўленка А.Г. і іншыя. Усяго — 278 подпісаў.

А калі папраўдзе...

Успомнім пра канал,

ці Настальгія па "развітому сацыялізму"?

Час ад часу рэспубліканскае радыё раніцай дае пералік знакамітых падзей таго ці іншага дня. Неяк у пачатку жніўня дыктар перадае: "Шэсцьдзесят два гады назад у гэты дзень быў адкрыты Беламорска-Балтыйскі канал". І без адзінага каментарыя. Сказаць, што той канал насіў імя "бацькі ўсіх народаў", дыктар не пасмеў ці не ведаў. А варта было нагадаць радыёслухачам, што ў будаўніцтве тым прынялі ўдзел сотні тысяч вязняў сталінскіх лагераў, у тым ліку нямала і беларусаў, раскулачаных і рэпрэсіраваных органамі НКУС па розных надуманых абвінавачваннях. Ведаю ў Слуцку чалавека, пенсіянера, які там быў разам з бацькам. Пасля раскулачвання таго адправілі на канал. Дванаццацігадовага сына не было на каго пакінуць, то бацька забраў яго з сабою.

Як сведчыць кніга А.Салжаніцына "Архіпелаг ГУЛАГ", на будаўніцтве канала загінулі звыш 50 тысяч вязняў. Але гэтыя факты радыёжурналістаў не цікавілі — ім хацелася адзначыць толькі дату.

Падобных "недомолвок" у іх перадачах у апошні час нямала. Аднойчы ўключыў рэпрадуктар — перадаюць вершы Янкі Купалы. Вось, думаю, добры падарунак паднеслі радыёслухачам, бо хто з беларусаў не любіць знакамітага песняра і патрыёта Беларусі. А ў перадачы прагучалі яго перадваенныя і не самыя лепшыя вершы, напісаныя паэтам хутчэй дзеля застрахоўкі ад магчымых рэпрэсій, чым па закліку сэрца: "Я калгасніца маладая", "На полі калгасным" і г.д. У іх паэт усхваляў "заможнае" калгаснае жыццё, хоць я памятаю тыя галодныя гады, калі жыхары нашай, не беднай да стварэння калгаса, вёскі харчаваліся летам лебядой, хлеб на стале быў рэдкім госцем, бо на працадзень выдавалі па сто грамаў збожжа. Але ж, мусіць, камусьці з журналістаў рэспубліканскага радыё вельмі карцела ўславіць дыхаючую на ладан калгасную сістэму, што даўно патрабуе рэфармавання.

Міхась ТЫЧЫНА.

Рэпартаж з ягад

Міханавічы. Наступны прыпынак — Савецкі Саюз

За поўгадзіны ходу электрычкі "Мінск—Асіповічы", на станцыі Міханавічы, мы, былыя савецкія людзі, робім свой маленькі бізнес.

Тут знаходзяцца ягадныя плантацыі саўгаса "Лошыца" — парэчнік і малінік. Збіраць ураджай запрашаюць гараджан, расплачваюцца часткай сабранага. Мінулым летам давалі рэкламу на тэлебачанні: прыехала паўМінска, прыйшлося выклікаць АМАП, каб стрымаць натоўп. Таму цяпер лічаць за лепшае чакаць тых, хто знойдзе шлях самастойна.

У электрычцы нас некалькі сотень: пенсіянеры, беспрацоўныя, адпускнікі. Па дарозе прыслухваемся да размоў больш спрактыкаваных зборшчыкаў. "Не дужа тут весела, мне здаецца. Працуеш, з кім паставяць, колькі атрымаеш — не ведаеш. Ды яшчэ наглядчыкі ўвесь час пакрыкваюць". — "З наглядчыкамі трэба сябраваць". — "Не ўсім тое спадабаецца. Са мной раз паехала суседка, былая балерына. А ў наступны раз ужо не захацела: нельга, кажа, трываць такое абыходжанне". — "Відаць, проста лайдачка". — "Чаму? Яна працуе, дзяцей у балетнай студыі вучыць. Але тут ёй — не балет".

Прыехалі, дацягнуліся да плантацый, атрымалі "фронт работы". Сапраўды, не балет: размеркавалі па дзесяць чалавек на радок, дазволілі працаваць да дзвюх гадзін папоўдні. І адразу пачалі "кіраваць". Загады часам супрацьлеглыя: "Не пакідайце ніводнай ягады, а то зараз пачняце па новай", "Не хапайце гэтую зелянінy, нестандарт прымаць не будзем". А яшчэ — сваркі амаль у кожнай "брыгадзе", калі суседу здаецца, што сусед працуе горш. А яшчэ — дыскусіі, ці можна з'есці ягадзіну падчас збору. Кажуць, тых, хто выяўляе добры апетыт, наглядчыкі заўважаюць, і "штрафуюць" пры атрыманні заробку. Таму есці трэба ўпотайкі. Забраць з плантацыі афіцыйна можна 15% сабранага — пры сёлетнім невялікім ураджаі за шэсць гадзін болей двух кіло не атрымаеш. Але калі заслужыш павагу наглядчыкаў — дадуць болей.

Навошта нам гэты бізнес? Можна зарабіць усе 100% на лясных "плантацыях", дзе не будзе наглядчыкаў і лаянкі з таварышамі. Можна займацца камерцыяй, можна ўдасканальвацца ў асноўнай, "гарадской" прафесіі, каб калісьці дазволіць сабе купляць парэчкі на рынку. Можна, нарэшце, пасадзіць кусты на дачы.

Але лес ураджаю не гарантуе, прафесійная кваліфікацыя ці дачныя здабыткі — справа будучыні, а "спекуляцыяй" мы пагарджаем, відаць, таму, што гандляваць не навучыліся. А тут дазволена зарабляць "чэсна".

Аснова нашага бізнесу — добрае веданне характараў кіраўніцтва. Адзін з наглядчыкаў — нейкі індыферэнтны, да яго ў давер не ўвойдзеш. Другі пакідае болей надзей: з кімсьці пажартуе, з кімсьці пасварыцца. Калі ў яго добры настрой, здараецца, адпускае дахаты з поўным вядром. Для паляпшэння настрою нядрэнна ў цяжкую хвіліну пачаставаць "боса" добрымі цыгарэтамі. Яшчэ ў размеркаванні ўраджаю ўдзельнічае Савельеўна, брыгадзір, — жанчына суровая, разумная і непадкупная. Яна арганізавала ўсю вытворчасць і трымае яе ў моцных руках ужо шмат гадоў. Адзіны шлях да яе сэрца — самаадданая і пастаянная праца. Тых, каго яна ацаніла, ставяць збіраць не толькі парэчку, але і маліну, якая ў Міханавічах — вялікі дэфіцыт.

Навошта ім гэта трэба? Калі на самай справе аддаюць не 15, а 30%, чаму так і не казаць — прыехала б болей зборшчыкаў? Калі трэба прэміраваць за эфектыўную і пастаянную працу — чаму не вызначыць канкрэтны памер прэмій? Калі наглядчыкі маюць умовы для раздорвання ўраджаю — чаму не паставіць дадатковы кантроль і не заахвочваць працу ў адпаведнасці са службовым абавязкам, а не настроем?

Усё правільна — інакш кайфу не будзе. Які ж кайф — працаваць і дакладна ведаць, колькі заробіш? Арыентавацца на нудныя і будзённыя лічбы, а не чакаць усмешкі фартуны на лагодным твары наглядчыка? Няхай сёння не пашчасціць — пашчасціць заўтра. Няхай і заўтра няўдача — у нашай вялікай сям'і павінны быць і нелюбімыя дзеці. Ці ж парэчак мы хочам? Не, толькі бацькоўскай ласкі начальства і сямейнага ўзаемаразумення з паплечнікамі.

Вяртаемся дамоў шчаслівыя: наглядчык быў сёння добры. На суседняй лаўцы нейкі хлопец скардзіцца спадарожніку: зноў, кажа, зарплата на заводзе менш, чым месяц таму, і ніхто не тлумачыць прычын. Можа, маўляў, звярнуцца ў камісію па працоўных спрэчках ці высветліць, чым займаецца прафсаюз? "Сабе даражэй, — адказвае вопытны таварыш. — Лепш запрасі ў госці свайго начальніка. Павячэраеце, вып'еце разам — пабачыш, і з зарплатай праблемы знікнуць". Разумны дзядзька, з ім можна ехаць у Міханавічы.

Марына КУНОУСКАЯ.

Грустные мысли о референдуме

Остроумная и в то же время достаточно действенная проверка на лояльность была устроена в этом году абитуриентам факультета журналистики БГУ. "Мысли о референдуме" — примерно так звучала одна из тем творческого сочинения, предложенная будущим представителям "четвертой власти". Учитывая большое количество президентских контролеров на вступительных экзаменах, нетрудно предположить судьбу тех, чьи мысли не совпадали с официальными. Остается надеяться, что большинство молодых людей предусмотрительно обошли опасную тему и предпочли философствовать о художественных особенностях (?!) белорусского ТВ или образе воина Великой Отечественной войны.

Павел КОТОВ.

Панарама жніўня

2. Двойка на ўроку Кінкеля

У жніўні адбыўся важны візіт у нашу краіну міністра замежных спраў Германіі Клаўса Кінкеля. Гэта была не радавая і не ардынарная падзея. Яшчэ напярэдадні прыезду нямецкім бокам быў перададзены ў беларускія сродкі масавай інфармацыі даволі паказальны артыкул спадара Кінкеля. Вядома, што дыпламаты — народ асцярожны, абачлівы, у друку "адкрытым тэкстам", як правіла, не гавораць. А тут мы бачым штосьці іншае. Адна з першых і вельмі ўплывовых асоб Германіі адкрыта крытыкуе амаль усе апошнія крокі прэзідэнта нашай краіны, пры гэтым, праўда, не называючы яго. Вось радкі з таго артыкула:

"Падфарбоўваннем сацыялістычнага мінулага немагчыма дабіцца будучага. Гэта адносіцца і да Беларусі. Было б памылкай спадзявацца на тое, што з дапамогай рэцэптаў учарашняга дня можна вырашыць усе эканамічныя праблемы. Шляху назад няма, няма і альтэрнатывы дарозе рэформаў. У Расіі, напрыклад, гэта даўно ўжо ўсвядомілі.

Без дэмакратычных структур працэсу прыняцця рашэнняў не можа быць пасяховых эканамічных пераўтварэнняў. Для сапраўдных рэформаў неабходны свабодна і сумленна выбраныя заканадаўчыя органы, а таксама ўмовы для бесперашкоднай дзейнасці партый, сродкаў масавай інфармацыі і прафсаюзаў — у той форме, у якой гэта прадугледжвае новая беларуская Канстытуцыя 1994 года. Ліквідацыя наяўных недахопаў у самыя кароткія тэрміны адпавядае карэнным інтарэсам самой Беларусі".

Вось дзе сапраўды глыбокі аналіз эканамічнага становішча на Беларусі, прычын яго крызісу. Адначасова К.Кінкель паказаў і шляхі выхаду з яго. Шкада толькі, што гэта яскрава бачаць госць з Германіі, лепшыя сыны Бацькаўшчыны, і, як мне здаецца, абсалютна не разумеюць гэтага ўлады.

Калі словы спадара Кінкеля перакласці на звычайную мову, дык мы бачым, што Германія, бадай, ужо адзіная ў Еўропе, яшчэ не губляе надзеі наставіць Беларусь на ісцінны шлях, дапамагчы ёй, але і яе цярпенне на зыходзе, і яна ўжо без усялякіх дыпламатычных цырымоній гаворыць нам, што будзе аказваць падтрымку толькі пры адной умове: калі кіраўніцтва стане нарэшце на шлях рэформаў, будзе паважаць законы, уласную Канстытуцыю і правы чалавека. І прыслухацца да гэтых парад варта па дзвюх прычынах: па-першае, яны сапраўды талковыя, а па-другое, Германія — наш другі партнёр па аб'ёму гандлю пасля Расіі.

Нельга не звярнуць увагі на афіцыйны друк Беларусі, які, асвятляючы візіт спадара Кінкеля, засведчыў свой непрафесіяналізм, ідэалагічную зашоранасць і заслужыў звычайную "двойку". Грубыя выпады на адрас такога ўплывовага палітыка такой вялікай і вельмі важнай у свеце дзяржавы толькі за тое, што ён сустрэўся з членамі апазіцыі, што з'яўляецца ў свеце звычайнай традыцыяй, не дастойна любой краіны і яе друкаваных органаў. Падаваць такую сустрэчу як нейкую "тайную вечерю", сакрэтны інструктаж — гэта прымітыўны і грубы выпад супраць дзяржавы, з якой прымалі госця. Няўжо людзі, якія вадзілі тым пяром, не разумеюць, што яны наносяць моцны ўдар па беларуска-германскіх адносінах, у цэлым па іміджу Беларусі ў вачах еўрапейскага і сусветнага супольніцтва? А можа, яны гэта рабілі наўмысна? Каб ізаляваць Беларусь у Еўропе і падштурхнуць у абдымкі "старэйшага брата" з вядомым "вохканнем": "А нас у Еўропе ніхто не чакае!?"

Думаю, што двойку заслугоўвае "кішэнны друк" і за асвятленне забастоўкі. Ен у большасці сваёй не даваў аб'ектыўнай інфармацыі, нават не спрабаваў унікнуць у прычыны сацыяльных канфліктаў, а імкнуўся толькі даказаць віну забастоўшчыкаў. Так, у праграме "Навіны" беларускага тэлебачання маладзенькія, з пуглівымі вочкамі дыктары спрабавалі сцвярджаць, што работнікі метро надта многа зарабляюць, дык хочуць болей. Вось, аказваецца, у чым прычына забастоўкі — у высокіх заробках. А адна з дзяржаўных газет адчытвала Федэрацыю прафсаюзаў: "Насцярожвае... нязадольнасць Федэрацыі прафсаюзаў канкрэтна ўплываць на канкрэтныя падзеі. Ясна, што перамовы, генеральныя і негенеральныя пагадненні — гэта гульні для прафсаюзных чыноўнікаў". Вось вам і яшчэ адзін вінаваты і адна прычына канфлікту — прафсаюзы. Выходзіць, гэта яны вінаваты, што несвоечасова выплочваецца зарплата, што парушаюцца правы чалавека, а не адміністрацыя прадпрыемства і ўлады.

* * *

Як бачым, жнівеньскія падзеі далі шмат матэрыялаў для роздуму і ўладам — Кабінету Міністраў і адміністрацыі прэзідэнта, і прафсаюзам усіх накірункаў, і друку. Хацелася б, каб усе яны сур'ёзна, без лішніх эмоцый усвядомілі галоўнае, што выцякае з апошніх падзей: курс, на які спіхнулі дзяржаву, памылковы, і нічога, акрамя сацыяльных канфліктаў і крызісаў, ён не прынясе.

Пара ўсім набрацца цвярозай палітычнай мудрасці і волі і ісці, нарэшце, тым шляхам, якім пайшлі ўжо амаль усе народы Еўропы. А ў каго няма такой рашучасці — падаць у адстаўку.

Панараму жніўня намаляваў Пётр КАВЕЦКІ.

Ад рэдакцыі.

Вядома ж, хацеў гэтага аўтар ці не хацеў, але многія яго назіранні носяць суб'ектыўны характар. Таму, друкуючы дадзены агляд, рэдакцыя "Народнай волі" не прэтэндуе, як кажуць, на ісціну ў апошняй інстанцыі. Наадварот, мы звяртаемся да прадстаўнікоў афіцыйных улад з прапановай выказацца па пытаннях, якія закрануты ў "панараме", уступіць, калі ёсць неабходнасць, у палеміку з аўтарам. Словам, жыццё — складаная штука, і на многія рэчы трэба глядзець з самых розных бакоў. "Народная воля" — адкрытая трыбуна для разнастайных поглядаў.

Ад вайсковай службы можна адкупіцца "законным хабарам"

— Сімвал нашай арміі — чырвоная зорка, — сказаў выконваючы абавязкі міністра абароны Рэспублікі Беларусь генерал-лейтэнант Леанід Мальцаў падчас нядаўняй сустрэчы з афіцэрамі 103-й гвардзейскай ваенна-паветранай дывізіі, якая зараз пераўтвараецца ў Мабільныя сілы. Такім чынам, наша краіна з'яўляецца зараз адзінай дзяржавай у СНД, якая пакінула за сабой ад былога СССР не толькі сцяг і герб, але і пяцівугольны чырвоны знак.

Гаворачы пра рэформу дэсантных войскаў, генерал патлумачыў яе неабходнасць недахопам спецыяльных самалётаў. "Каб дэсантаваць вашу дывізію, трэба было ўзняць у паветра ўсю транспартную авіяцыю СССР, — сказаў Мальцаў. І дадаў: — Згодна з новай абароннай ваеннай дактрынай Беларусі, Мабільныя сілы замест наступальных аперацый, уласцівых дэсантным войскам раней, павінны цяпер быць гатовымі як знішчаць паветраныя дэсанты ворага, так і змагацца з бандфарміраваннямі".

Адкуль возьмуцца бандфарміраванні на нашай тэрыторыі, генерал не ўдакладніў. Але, відаць, не выпадкова ўспомніў: "Да чаго вядзе неабучанасць, вы ўсе бачылі на прыкладах Чэчні і Югаславіі".

Выконваючы абавязкі міністра высока ацаніў баяздольнасць беларускай арміі, зазначыўшы, што гэтаму спрыяе прыток кантрактнікаў. Ен паведаміў аб ужо гатовым праекце закона, які прадугледжвае альтэрнатыўную службу. Больш таго, багатыя бацькі змогуць за грошы вызваліць сваіх сыноў ад арміі. "А за гэтую суму можна будзе наняць кантрактніка".

Што ж, з эканамічнага боку гэта, магчыма, і ўдалае рашэнне. Але ёсць і другі бок справы. Калі раней генералы, палкоўнікі, дзеячы партсавецкай наменклатуры, іншыя дзяржаўныя чыноўнікі маглі "непрыкметна" выратаваць сваіх нашчадкаў ад Афганістана і накіраваць іх у Таманскую дывізію ці ў іншыя элітныя часці, то цяпер тыя ж начальнікі і дзялкі зусім адкрыта выкупяць сынкоў з арміі, дадуць ёй нешта накшталт законнага хабару, а потым, зноў жа за грошы, забяспечаць ім месцы ў прэстыжных ВНУ.

Кантрактная служба ёсць у многіх краінах, але нідзе яшчэ не дадумаліся да таго, каб адкупляцца ад вайсковага прызыву...

Уладзімір СУПРАНЁНАК.

Наш народ достоин...

В это тревожное для нашей страны время мы, рабочие Минского опытно-экспериментального завода "Белспецкоммунмаш", не можем быть равнодушными наблюдателями за происходящими в Республике Беларусь событиями.

Сознавая свою ответственность за судьбу нынешнего и будущих поколений, мы не имеем права допустить, чтобы народ оказался за чертой закона, в пучине бесправия, страха и нищеты.

Нам непонятно, зачем правительству, команде президента захотелось исказить причины забастовки на Минском метрополитене. Рабочие метро не требовали повышения зарплаты. Сумму в 3—4 млн. руб. у некоторых работников составляют отпускные и ранее начисленные премиальные. Нашему народу нельзя больше лгать, он достоин правды!

Мы выражаем протест против незаконного увольнения всех работников метрополитена, требуем незамедлительного их восстановления на прежнюю работу.

Мы протестуем против репрессии власти — ареста руководителей профсоюзного движения Быкова, Макарчука, Канаха и требуем их освобождения.

Мы осуждаем штрейкбрехеров, подменивших машинистов Минского метрополитена во время забастовки.

<u>От редакции.</u> Это заявление, под которым 59 подписей, принес в редакцию рабочий Е.Якубович. Он сообщил, что сбор подписей продолжается. И на их предприятии, и на других.

Советы объединяться отказались

Отрицательным оказался результат обсуждения городским и районным Советами народных депутатов Столинщины вопроса их объединения. Проживающим на территории горсовета 16 тысячам человек только справок выдается около 15 тысяч, а еще есть жалобы, заявления, просьбы... Одним из аргументов назвали то, что в случае слияния вся эта лава хлынет в райисполком...

Петр МАСЛОВ.

"Дзяцей Чарнобыля" прымушаюць маніць

Несприяльная санітарна-эпідэміялагічная абстаноўка на Магілёўшчыне прымусіла ўлады прымаць сёлета спецыяльны план мерапрыемстваў, каб папярэдзіць магчымыя ўскладненні ў асеннезімовы перыяд. А трывожныя звесткі аб росце інфекцыйных захворванняў дасягнулі нават Нямеччыны, дзе грамадская супольнасць вырашыла ўнесці свой уклад ва ўмацаванне нашага санітарнага дабрабыту.

Напрыканцы ліпеня з горада Карлоруз было адпраўлена каля двух тон мыючых сродкаў з даручэннем камітэту "Дзеці Чарнобыля" размеркаваць іх сярод клінік і сацыяльна неабароненых жыхароў Магілёва. Нямецкія дабрачынцы, фірма "Хенкель" і Евангелічная акадэмія Бадон са сваіх ахвяраванняў аплацілі кошт дастаўкі санітарнай дапамогі праз Беларускую асацыяцыю міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў і добрасумленна афармілі ўсе дакументы аб гуманітарным характары грузу.

Аднак "хэпі энда" для магілёўцаў так і не адбылося. Прадстаўнікі камітэта "Дзеці Чарнобыля" амаль два тыдні шукалі след згубленага на дарогах Беларусі транспарту. Як вынікае з прэс-інфармацыі камітэта, за гэты тэрмін груз вытрываў некалькі мытных даглядаў, пасля чаго частка прывабных пакункаў з парашком "Persil" і "DRO" проста знікла. У дадатак да гэтага на мінскай мытні дэкларацыя нямецкіх дабрачыннікаў была перароблена на камерцыйную, каб спагнаць з багатых немцаў і іх сяброў мыту ў памеры 15% кошту дэфіцытнага грузу. У рэшце рэшт ён быў заарыштаваны на складзе Магілёўскай абласной бальніцы.

Цяпер "Дзецям Чарнобыля" прапанавана ўтаіць ад нямецкіх дабрачынцаў знікненне часткі іх дапамогі падчас афіцыйнага патранажу кампетэнтных органаў Беларусі і паведаміць у Карлоруз, што за права дапамагчы гаротным магіляўчанам жыхары гэтага ўзорна чыстага горада павінны ўнесці ў бюджэт Рэспублікі Беларусь у дадатак да ахвяраванага яшчэ некалькі сот даляраў.

Ёсць яшчэ і іншы шлях. Магілёўская абласная бальніца, у якой вялікая нястача мыючых сродкаў, вымушана аплаціць мыту з сумы, выдаткаванай на лячэнне і ўтрыманне хворых. Праўда, гэта папоўніць банкаўскую запазычанасць бальніцы памерам у 2 мільярды яшчэ на некалькі мільёнаў.

Медыкі пакорліва схіляюць галовы перад мытнікамі, і ўсе разам заклікаюць камітэт "Дзеці Чарнобыля" стаць законапаслухмяным і паважаць беларускія парадкі. Але старшыня камітэта Наталля Рослава, не таячыся, ацэньвае гэты прэцэдэнт як процілеглы этычным нормам, інтарэсам жыхароў Магілёва і наогул здароваму сэнсу.

Камітэт "Дзеці Чарнобыля" накіраваў свае звароты ў шматлікія кантралюючыя дэпартаменты адміністрацыі прэзідэнта, у якіх патрабуе ад чыноўнікаў у дачыненнях з Еўропай і ўласнымі грамадскімі ініцыятывамі кіравацца міжнароднымі нормамі і інтарэсамі бядотных жыхароў Беларусі. Адказу пакуль што няма.

Мядзведзь у горадзе як прыкмета восеньскіх выбараў

Вядомы ў Магілёве прадпрымальнік, уладальнік папулярнага начнога клуба "У Сафрона" Анатоль Аношкін днямі ў чарговы раз шакіраваў грамадскасць горада сваімі дабрачыннымі ідэямі.

У чэрвені, на Дзень моладзі, які супаў з нараджэннем дачкі спадара Аношкіна, шчаслівы бацька аплаціў кошт у некалькі тысяч даляраў святочнага феерверку для горада. А цяпер у падарунак маленькім магіляўчанам Анатоль прывёз з Кастрамы 9-месячнага медзведзяня Дашку. Аднак падарунак пакуль што ніхто прымаць не збіраецца. Народ у мэрыі толькі падаецца назад са словамі "не трэба" пры ўпамінанні пра мядзведзя.

Пачынаючы дабрачынец вымушаны быў звярнуцца да насельніцтва Магілёва з просьбай дапамагчы ў арганізацыі заасаду ці заапарка, дзе б магла жыць і забаўляць дзяцей мядзведзіца Дашка.

Анатоль Аношкін сцвярджае, што ён ніколі не будзе жыць ідэалогіяй "хапнуць паболей і змыцца". А таму яму хочацца зрабіць усё магчымае, каб жыць у Магілёве стала і лепей і цікавей перш за ўсё для дзецям.

Аднак няцяжка заўважыць, што ўсплеск грмадскай дзейнасці гэтага бізнесмена супаў з яго жаданнем пайсці ў вялікую палітыку. Праўда, на прайшоўшых выбарах сп.Аношкіну не пашанцавала. Ён будзе браць удзел у чарговых восеньскіх і ўпарта будзе змагацца да канца, бо, па яго ж словах, "палітычная дзейнасць — гэта магчымасць перавесці светлую перспектыву ў рэальнасць".

Ілона ІВАНОВА.

Завершились миротворческие учения-95 стран — участниц "Партнерства во имя мира"

В США завершились военные учения "Кооператив Наггет-95", ставшие первыми учениями подобного рода в рамках программы НАТО "Партнерство во имя мира".

Двухнедельные маневры в обстановке, максимально приближенной к боевой, в условиях почти 40-градусной жары, высокой влажности воздуха и штормового ветра проводили 4000 солдат из США и других стран.

Учения "КН-95" проводились по инициативе командования сил НАТО в Атлантике под руководством верховного главнокомандующего силами США в Атлантике.

Цель учений — выработать у подразделений стран-участниц навыки совместного проведения миротворческих и гуманитарных операций.

В учениях приняли участие подразделения Канады, Великобритании, США, а также стран—участниц ПИМ: Албании, Болгарии, Чехии, Эстонии, Венгрии, Киргизии, Латвии, Литвы, Польши, Румынии, Словакии, Словении, Украины и Узбекистана.

Амерыканцам небяспечна з'яўляцца ў Санкт-Пецярбургу ў пачатку верасня

Дзяржаўны дэпартамент ЗША папярэдзіў амерыканскіх грамадзян, якія накіроўваюцца ў Санкт-Пецярбург, пра тое, што ў пачатку верасня яны могуць падвергнуцца нападзенням тэрарыстаў.

У прыватнасці, у заяве Дзяржаўнага дэпартамента гаворыцца аб тым, што ўрад Злучаных Штатаў атрымаў інфармацыю аб магчымых тэрарыстычных акцыях супраць амерыканскіх грамадзян, якія накіроўваюцца ў Санкт-Пецярбург напярэдадні жніўня і ў пачатку верасня.

Амерыканскім грамадзянам дадзена рэкамендацыя не прымаць падарункаў ці пакетаў, а таксама не пакідаць без нагляду свой багаж.

Насколько опасен авиатранспорт?

В минувшем году произошло в общей сложности 47 авиакатастроф, в которых погибли 1385 человек.

На первый взгляд эта цифра кажется ужасной. Но действительно ли риск столь велик? В 1994 году на самолетах летали два миллиарда человек. На миллиард километров в воздухе приходится 1,3 случая со смертельным исходом, а на автомобильных дорогах — 19,6.

Среднестатистическому авиапассажиру нужно 130 лет днем и ночью находиться в воздухе, чтобы, по теории вероятности, стать жертвой катастрофы. Причинами авиакатастроф в большинстве случаев являются следующие: низкая квалификация экипажа, высокая изношенность машинного парка и отсутствие необходимых запасных частей.

Из грязи да в князи

Новый тому пример — девятилетний американец Лоуренс Шульц. Он обнаружил огромный сапфир на дне ведра с грязью. Мальчик уплатил 10 долларов за разрешение просеять отходы на шахте в Северной Каролине, где прежде люди добывали драгоценные камни. Во время этой нелегкой работы ему и улыбнулась фортуна.

По мнению экспертов, камень весом 1061 карат — крупнейший из когда-либо найденных в Северной Каролине — может стоить свыше 35 тысяч долларов. Семья Лоуренса тоже счастлива: камушек поможет сыну получить приличное образование.

Огуречная поляна на Южном полюсе

Проект выращивания овощей на льду разработали американские ученые, работающие на Южном полюсе.

Ученые намерены для этого использовать искусственный свет и очищенные канализационные стоки. По плану огород в 15 квадратных метров будет давать огурцы, картофель и зелень, то есть чего люди лишены в течение долгих шести зимних месяцев. Кстати, план антарктического огородничества разработан Национальным управлением по аэронавтике и освоению космического пространства. Так что с думой о космосе заботимся о земляках.

ЭКСТРА-ПРЕСС.

Повышение температуры на земле угрожает здоровью людей

Ученые сообщают, что радикальные климатические перемены, вызванные глобальным потеплением, способны увеличить число ежегодных жертв тропических болезней, таких как малярия или желтая лихорадка, на сотни тысяч человек.

Используя глобальные климатические модели, ученые также отмечают возможность того, что в промышленно развитых странах участятся случаи гибели людей от летних тепловых ударов. В этом году более 500 жителей Чикаго — одного из крупных американских городов — умерли под воздействием удушающей жары, стоявшей в городе в течение 5 дней, когда температура доходила до 41 градуса Цельсия.

Однако ученые считают, что особенно фатальным потепление окажется для развивающихся стран, где значительно возрастет заболеваемость инфекционными болезнями вследствие массового распространения комаров и других насекомых-паразитов.

Результаты исследований, проведенных профессором медицинского факультета Гарварда Полом Эпстайном, показывают, что потепление расширяет масштабы заболеваемости малярией.

"В Африке малярийные комары распространились в высокогорных районах Кении, угрожая Найроби; прежде же случаев малярии в этом районе не отмечалось, — сообщил Эпстайн. — Похоже, это произошло в течение последних 20 лет, поскольку с середины 70-х годов ситуация стала резко меняться".

Майкл Левенсон, эколог из Центра исследований в области международного развития в Нью-Дели (Индия), связал повышение среднегодовой температуры в Руанде в 1987 г. на один градус с 337-процентным ростом в тот год заболеваемости малярией.

Ученые усматривают связь между периодами потепления и выпадения обильных дождей, вызванных Эль-ниньо — циклическим потеплением тропического пояса Тихого океана, оказывающим воздействие на мировой климат, и распространением различных, в том числе инфекционных, заболеваний.

В Зимбабве и на западе Мозамбика ассоциируемые с Эль-ниньо периоды засухи регулярно вызывали инфицирование крыс, которые являются переносчиками возбудителей различных болезней.

